
Institute of Political Studies



Political Sphere

Palitsfera Working Papers No. 8/2026

Свае ці чужыя?

Як успрымаюць беларусаў у Польшчы

Palitsfera Working Papers No. 8/2026

Свае ці чужыя?

Як успрымаюць беларусаў у Польшчы

Юрый Стакавецкі
Андрэй Казакевіч, PhD у галіне палітычных навук

Інстытут палітычных даследаванняў
«Палітычная сфера»

Уводзіны

Даследаванне было распрацавана Інстытутам палітычных даследаванняў «Палітычная сфера» ў межах праекта “Strengthening of Independent Belarusian Social, Political and Economic Research”, які фінансуецца Еўрапейскім саюзам. Збор даных у Польшчы ажыццяўляла даследчая кампанія SW Research у траўні 2026 года. У апытанні ўзялі ўдзел 1006 жыхароў Польшчы ва ўзросце ад 18 гадоў. Было праведзена 800 анлайн-інтэрв’ю праз SW Panel і 200 тэлефонных інтэрв’ю з інтэрв’юерамі. Пры фарміраванні выбаркі ўлічваліся пол, узрост і памер населенага пункта (GUS). Статыстычнае ўзважванне не прымянялася.

Анкета ахоплівала стаўленне да беларусаў, якія жывуць у Беларусі і Польшчы, гісторыка-культурныя ўяўленні, асабістыя кантакты, міграцыю, эканоміку, бяспеку, ацэнкі беларускага палітычнага рэжыму, а таксама перавагі адносна палітыкі Польшчы ў дачыненні да беларускіх уладаў і дэмакратычнай апазіцыі. Для аналізу адрозненняў выкарыстоўваліся табліцы спалучанасці. Статыстычная значнасць сувязі паміж катэгарыяльнымі зменнымі правяралася з дапамогай крытэрыю χ^2 Пірсана; статыстычна значнымі лічыліся адрозненні пры $p<0,05$. Для ацэнкі сілы выяўленай сувязі выкарыстоўваўся V Крамера: чым бліжэйшае яго значэнне да 1, тым мацнейшая сувязь паміж зменнымі, а значэнні, блізкія да 0, сведчаць пра слабую сувязь. Вынікі, заснаваныя на малалікіх катэгорыях або табліцах з вялікай колькасцю ячэек з нізкімі чаканымі частотамі, інтэрпрэтаваліся асцярожна. Адказ «цяжка сказаць» захоўваўся як самастойная змястоўная катэгорыя, калі канкрэтны аналіз не патрабаваў яго выключэння.

Дадаткова была праверана магчымая сістэматычная памылка, звязаная з узроўнем адукацыі. Для гэтага разлічылі вагавыя каэфіцыенты на аснове даных Statistics Poland (GUS) пра размеркаванне дарослага насельніцтва Польшчы паводле ўзроўню адукацыі і супаставілі асноўныя вынікі для ўзважанай і няўзважанай выбарак. Узважванне не прывяло да змястоўна значных змен вынікаў, таму ў далейшым аналізе выкарыстоўваюцца няўзважаныя даныя.

Асноўныя лініі падзелу ў польскім грамадстве

У адрозненне ад украінскага даследавання, польскія даныя не дазваляюць вылучыць устойлівы сацыяльна-дэмаграфічны профіль рэспандэнта з пазітыўным або негатыўным стаўленнем да беларусаў. Асобныя статыстычна значныя адрозненні існуюць, але яны пераважна невялікія, нелінейныя і не складаюцца ў адзіную паслядоўную карціну.

Фактары пазітыўнага і негатыўнага стаўлення. Найбольш прыкметная сувязь з полам, аднак яна адлюстроўвае найперш ступень пэўнасці пазіцыі. Мужчыны часцей даюць змястоўную пазітыўную або негатыўную ацэнку, жанчыны часцей выбіраюць варыянт «цяжка сказаць». Розніца ў долі пазітыўных адказаў паміж мужчынамі і жанчынамі складае 9,1 п.п. для беларусаў, якія жывуць у Беларусі, і 11,7 п.п. для беларусаў, якія жывуць у Польшчы; адначасова доля тых, хто не вызначыўся, сярод жанчын вышэйшая адпаведна на 10,8 і 12,7 п.п.

Даход, занятасць і адукацыя. Гэтыя характарыстыкі адрозніваюць адказы ў асобных катэгорыях, але залежнасці не з'яўляюцца прамымі: больш высокі даход або адукацыя не азначаюць аўтаматычна больш пазітыўнага стаўлення да беларусаў. Частка разыходжанняў прыпадае на малалікія групы, таму іх нельга трактаваць як устойлівы сацыяльны профіль.

Фінансавае становішча і мова хатніх зносін. Гэтыя прыкметы праяўляюцца найперш у стаўленні да беларусаў, якія жывуць у Беларусі, але не паўтараюцца гэтак жа ўстойліва ў ацэнцы беларусаў, якія жывуць у Польшчы. Таму яны хутчэй указваюць на асобныя адрозненні паміж групамі, чым на падзел у грамадстве.

Фактары, якія не фарміруюць устойлівай лініі. Узрост, памер населенага пункта, ваяводства і сямейнае становішча не даюць паслядоўнага эфекту для агульнага стаўлення да беларусаў. У прыватнасці, даныя не дазваляюць гаварыць пра раскол паміж пакаленнямі або ўстойлівы рэгіянальны профіль сімпатыі і антыпатыі.

Асабістыя кантакты і культурная дасведчанасць

Наяўнасць кантактаў з беларусамі, як і веданне гістарычных і культурных дзеячаў Беларусі, значна часцей спалучаецца з пазітыўным стаўленнем.

Такім чынам, сацыяльна-дэмаграфічныя характарыстыкі ў Польшчы тлумачаць галоўным чынам ступень пэўнасці адказу і асобныя адрозненні паміж групамі, але не зводзяцца да адзінага партрэта прыхільніка або праціўніка беларусаў.

Залежнасць змястоўных ацэнак ад сімпатыі або антыпатыі да беларусаў

Для аналізу рэспандэнты з пэўным стаўленнем да беларусаў, якія жывуць у Беларусі, былі аб'яднаныя ў дзве групы: негатыўна настроеныя — 177 чалавек і

пазітыўна настроеныя — 501 чалавек. Адказы «цяжка сказаць» на пытанне пра стаўленне да беларусаў у Беларусі ў гэтым параўнанні не ўлічваліся.

Наймацнейшая сувязь назіраецца паміж стаўленнем да беларусаў у Беларусі і стаўленнем да беларусаў, якія жывуць у Польшчы. Сярод пазітыўна настроеных да беларусаў у Беларусі 83,7% таксама пазітыўна ставяцца да беларусаў у Польшчы, тады як сярод негатыўна настроеных такіх толькі 22,0%. У апошняй групе 51,4% негатыўна ставяцца і да беларусаў у Польшчы; сярод пазітыўна настроеных гэтая доля складае толькі 9,8%. Такім чынам, стаўленне да дзвюх груп цесна звязана, хоць поўнага супадзення паміж імі няма: частка рэспандэнтаў, якія негатыўна ацэньваюць беларусаў у самой Беларусі, прыкметна мякчэй ставіцца да тых, хто жыве ў Польшчы. Сувязь паміж двума паказчыкамі з'яўляецца наймацнейшай сярод разгледжаных змястоўных пытанняў.

У адрозненне ад украінскага даследавання, у Польшчы гісторыка-культурныя ўяўленні ўтвараюць адну з найбольш прыкметных ліній адрознення паміж групамі. Сярод пазітыўна настроеных 50,7% лічаць беларусаў самастойным народам, сярод негатыўна настроеных — 22,0%. Наадварот, уяўленне пра беларусаў як адгалінаванне рускага народа падтрымліваюць адпаведна 27,7% і 58,8%. Выключна польскай спадчыну Рэчы Паспалітай лічаць 62,1% негатыўна настроеных і 36,5% пазітыўна настроеных, тады як уяўленне пра агульную спадчыну ўсіх народаў, якія яе насялялі, выбіраюць адпаведна 18,1% і 36,3%. Стаўленне да магчымага беларускага герба, натхнёнага сімволікай Рэчы Паспалітай, таксама прыкметна адрозніваецца.

Пры гэтым простая культурная дасведчанасць звязана са стаўленнем значна слабей. Сярод негатыўна настроеных 66,1% не ведаюць ніводнай з пералічаных беларускіх гістарычных і культурных асоб, сярод пазітыўна настроеных — 54,3%. Аднак веданне большасці асобных імёнаў або ўвогуле не звязана са стаўленнем, або сувязь застаецца невялікай. Гэта дазваляе адрозніваць дзве з'явы: пазітыўнае стаўленне звязана найперш з пэўнымі ўяўленнямі пра беларускую ідэнтычнасць і агульную гістарычную спадчыну, а не проста з колькасцю вядомых рэспандэнту беларускіх дзеячаў.

Яшчэ больш выразна стаўленне да беларусаў звязана з пытаннямі іх прысутнасці ў Польшчы. Асабістыя кантакты з беларусамі маюць 23,6% пазітыўна настроеных і 8,5% негатыўна настроеных. Рашэнне Польшчы прыняць вымушаных эмігрантаў пасля падзей 2020 года станоўча ацэньваюць 70,0% пазітыўна настроеных і 45,2% негатыўна настроеных. Беларусаў, якія жывуць у Польшчы, не лічаць пагрозай 73,6% пазітыўна настроеных і 56,5%

негатыўна настроеных. Больш выразная сувязь асабістых кантактаў з агульнай ацэнкай — яшчэ адно адрозненне польскіх даных ад украінскіх.

Станоўча ўнёсак беларусаў у польскую эканоміку ацэньваюць 56,3% пазітыўна настроеных і 25,5% негатыўна настроеных. Абмежаваць цяперашнюю колькасць працоўных мігрантаў або цалкам спыніць далейшую міграцыю хочуць 72,4% негатыўна настроеных і 33,8% пазітыўна настроеных. Наадварот, дазваляць міграцыю на агульных для краін па-за ЕС умовах або спецыяльна яе стымуляваць прапануюць 55,5% пазітыўна настроеных і 20,3% негатыўна настроеных.


Палітычныя ацэнкі Беларусі таксама адрозніваюцца, аднак карціна тут складанейшая. Крытычная ацэнка рэжыму ўласцівая абедзвюм групам і не з'яўляецца прамым вынікам характару стаўлення да беларусаў.

Негатыўна настроеныя крыху часцей даюць жорсткія ацэнкі беларускай дзяржаве, яе залежнасці ад Расіі і легітымнасці Аляксандра Лукашэнкі, але гэтыя сувязі слабейшыя за адрозненні ў гісторыка-культурных і міграцыйных пытаннях. Веданне Святланы Ціханоўскай таксама адрозніваецца параўнальна ўмерана: пра яе чулі 65,9% пазітыўна настроеных і 54,8% негатыўна настроеных.

Значна мацней адрозніваюцца адказы пра пажаданую палітыку Польшчы. Сярод негатыўна настроеных да беларусаў 37,9% выступаюць за міжнародную ізаляцыю і санкцыі супраць беларускіх уладаў, сярод пазітыўна настроеных — 15,4%. Шырокае супрацоўніцтва з уладамі Беларусі падтрымліваюць адпаведна 4,0% і 19,8%. У дачыненні да дэмакратычнай апазіцыі цалкам адмовіцца ад супрацоўніцтва хочуць 28,2% негатыўна настроеных і 5,6% пазітыўна настроеных, тады як публічнае і ўсебаковае супрацоўніцтва падтрымліваюць 18,1% і 41,1%.

Такім чынам, пазітыўнае і негатыўнае стаўленне да беларусаў звязана з дастаткова цэласнымі наборамі ўяўленняў. Наймацнейшыя адрозненні праходзяць праз стаўленне да беларусаў, якія жывуць у Польшчы, працоўную міграцыю, эканамічны ўнёсак, стаўленне да дэмакратычнай апазіцыі і гісторыка-культурныя ўяўленні. Пры гэтым ацэнкі беларускай дзяржавы і рэжыму выяўляюцца менш палярызаванымі: крытычнае стаўленне да іх шырока распаўсюджана, незалежна ад стаўлення да саміх беларусаў. Таму негатыўнае стаўленне да беларусаў нельга зводзіць выключна да непрымання рэжыму, а пазітыўнае — да яго больш мяккай ацэнкі. Хутчэй гаворка ідзе пра больш шырокі комплекс уяўленняў пра беларусаў як народ, мігрантаў, удзельнікаў польскага грамадства і аб'ект польскай замежнай палітыкі.

Асноўныя індыкатары і адхіленні ад усёй выбаркі



Іл. 1. Асноўныя індыкатары і адхіленні ад усёй выбаркі

Паказаны асноўныя індыкатары з найбольш прыкметнымі адхіленнямі; адхіленні разлічаны адносна ўсёй выбаркі (N=1006).

Агульнае стаўленне да беларусаў

Да беларусаў, якія жывуць у Беларусі, пазітыўна ставяцца 49,8% рэспандэнтаў: 37,3% хутчэй пазітыўна і 12,5% — безумоўна пазітыўна. Негатыўныя ацэнкі складаюць 17,6%, прычым адназначна негатыўны адказ выбіраюць толькі 3,9%. Яшчэ 32,6% апытаных цяжка вызначыць сваё стаўленне. Такое размеркаванне паказвае не палярызацыю, а спалучэнне ўмеранай сімпатыі з вялікай зонай нявызначанасці.

Да беларусаў, якія жывуць у Польшчы, стаўленне выглядае падобным чынам. Пазітыўныя адказы складаюць 55,7%, негатыўныя 16,5%, а доля тых, хто не вызначыўся, зніжаецца нязначна — да 27,8%.



Іл. 2. Стаўленне да беларусаў, якія жывуць у Беларусі і Польшчы, %

Заўвага: уся выбарка, N=1006.

Ацэнкі беларусаў у Беларусі і Польшчы цесна звязаныя, але не тоесныя. Сярод тых, хто пазітыўна ставіцца да беларусаў у Беларусі, 83,6% гэтак жа ацэньваюць беларусаў у Польшчы. Сярод негатыўна настроеных да першай групы 51,4% захоўваюць негатыўную ацэнку і ў другім выпадку, у той час як амаль чвэрць ставіцца да беларусаў у Польшчы пазітыўна. Гэта паказвае, што частка

рэспандэнтаў адрознівае агульнае стаўленне да грамадзян Беларусі і іх прысутнасць у польскім грамадстве.

Адказ «цяжка сказаць» у абодвух выпадках выбірае больш за чвэрць апытаных. Асабліва часта гэты адказ выбіраюць жанчыны, а таксама некаторыя групы з ніжэйшымі даходамі і ўзроўнем адукацыі.

Гэтую катэгорыю нельга безумоўна выключаць з аналізу: яна можа адлюстроўваць слабую ўцягнутасць, недахоп інфармацыі або нежаданне пераносіць стаўленне да беларускай дзяржавы на людзей. Таму адказы «цяжка сказаць» захоўваюцца ў асноўным аналізе, а параўнанні без іх выкарыстоўваюцца толькі для дадатковай праверкі.



Іл. 3. Стаўленне да беларусаў у Польшчы ў залежнасці ад стаўлення да беларусаў у Беларусі, %

Заўвага: у параўнанні не ўлічаны адказы «цяжка сказаць» на пытанне пра стаўленне да беларусаў у Беларусі.

Беларусь як дзяржава

Большасць рэспандэнтаў — 69,7% — лічаць Беларусь аўтарытарнай дзяржавай: 27,0% — пераважна, 42,6% — цалкам. Дэмакратычнай яе называюць 15,8%, яшчэ 14,5% цяжка адказаць. Такая ацэнка пераважае і сярод пазітыўна, і сярод


негатыўна настроеных да беларусаў. Аднак апошнія адказваюць больш жорстка: цалкам аўтарытарнай Беларусь лічаць 54,8% прадстаўнікоў гэтай групы і 39,7% пазітыўна настроеных.

Ацэнка рэжыму мае больш выразную сацыяльную структуру, чым непасрэднае стаўленне да беларусаў. Адрозненні выяўляюцца паводле полу, узросту, занятасці, даходу, адукацыі і фінансавага становішча. Найбольш устойліва аўтарытарны характар Беларусі прызнаюць рэспандэнты з лепшым фінансавым становішчам, старэйшыя і больш адукаваныя групы.

З узростам найперш зніжаецца доля адказу «цяжка сказаць». Аўтарытарнай Беларусь лічаць 61,9% рэспандэнтаў ва ўзросце 18–29 гадоў і 79,9% людзей, старэйшых за 60 гадоў. Ва ўсіх узроставых групах меншасць называе яе дэмакратычнай. Матэрыяльнае становішча ўплывае падобным чынам: сярод людзей з устойлівым дастаткам адказ «цяжка сказаць» сустракаецца радзей, а ў найбольш уразлівай групе — часцей.

Меркаванні адрозніваюцца таксама паводле полу, занятасці, даходу і адукацыі. Аднак частка разыходжанняў датычыць не ацэнкі палітычнага ладу, а таго, ці гатовыя рэспандэнты даць адназначны адказ. Калі не ўлічваць тых, хто выбраў «цяжка сказаць», адрозненні паміж сацыяльнымі групамі становяцца больш прыкметнымі.

Ацэнка палітычнага рэжыму Беларусі, %




Іл. 4. Ацэнка палітычнага рэжыму Беларусі, %

Заўвага: адказ «цяжка сказаць» уключаны ў размеркаванне.

Залежнай ад Расіі Беларусь лічаць 69,5% рэспандэнтаў. 28,8% мяркуюць, што Расія ў значнай ступені вызначае замежную палітыку краіны, 31,1% гавораць пра поўны кантроль, 9,5% — пра фактычную акупацыю. Цалкам самастойнай Беларусь называюць 4,5%, самастойнай пад прыкметным расійскім уплывам — 14,6%. Ацэнка залежнасці найцясней звязана з характарыстыкай рэжыму: сярод тых, хто лічыць Беларусь цалкам самастойнай, толькі 13,3% адносяць яе да аўтарытарных дзяржаў, а сярод тых, хто кажа пра поўны кантроль Расіі, — 92,7%.

Уяўленні пра залежнасць Беларусі ад Расіі адрозніваюцца паводле полу, узросту, даходу і фінансавага становішча. Старэйшыя і матэрыяльна больш устойлівыя рэспандэнты часцей выбіраюць варыянты поўнага кантролю або фактычнай акупацыі, тады як маладыя і менш забяспечаныя часцей вагаюцца з адказам.

Адрозненні паводле полу праяўляюцца ў выбары ступені залежнасці: мужчыны часцей гавораць пра поўны кантроль або фактычную акупацыю, жанчыны часцей выбіраюць умераную залежнасць або нявызначанасць. З узростам доля найбольш жорсткіх ацэнак павялічваецца, аднак ва ўсіх групах большасць прызнае істотны ўплыў Расіі.



Іл. 5. Ацэнка самастойнасці Беларусі ў замежнай палітыцы, %

Заўвага: N=1006.

Беларуская палітыка


Аляксандра Лукашэнку не прызнаюць легітымным лідарам Беларусі 69,0% апытаных: 47,3% выбралі адказ «безумоўна не», 21,7% — «хутчэй не». Процілеглай думкі прытрымліваюцца 16,1%, яшчэ 14,9% не змаглі адказаць.

Адмоўная ацэнка пераважае як сярод негатыўна настроеных да беларусаў (75,7%), так і сярод пазітыўна настроеных (65,5%). Яна цесна звязана з уяўленнем пра палітычны лад краіны: 92,4% тых, хто выбраў «безумоўна не», называюць Беларусь аўтарытарнай дзяржавай.

Сярод непасрэдна палітычных пытанняў гэтае найбольш прыкметна звязана з сацыяльна-дэмаграфічнымі фактарамі.

Старэйшыя, больш адукаваныя і матэрыяльна забяспечаныя рэспандэнты радзей прызнаюць легітымнасць Лукашэнкі. Сярод жанчын і моладзі больш тых, хто выбірае адказ «цяжка сказаць».

Ва ўзросце 18–29 гадоў Лукашэнку не прызнаюць легітымным лідарам 56,8% рэспандэнтаў, а сярод людзей, старэйшых за 60 гадоў, — 81,9%. Розніца ўзнікае галоўным чынам таму, што з узростам змяншаецца доля тых, хто не вызначыўся, і расце доля катэгарычных адказаў. Гэта не азначае, што моладзь часцей падтрымлівае Лукашэнку: сярод яе проста больш тых, хто не мае пэўнага меркавання.




Іл. 6. Ацэнка легітымнасці Аляксандра Лукашэнкі, %

Заўвага: N=1006.

Пра Святлану Ціханоўскую чулі 60,4% удзельнікаў апытання, 27,5% адказваюць, што не ведаюць яе, 12,0% вагаюцца. Пра Святлану Ціханоўскую значна часцей чулі старэйшыя рэспандэнты. Адрозненні ёсць і паміж прыхільнікамі розных партый: пад электаратамі тут маюцца на ўвазе групы выбаршчыкаў, якія падтрымліваюць розныя палітычныя сілы. Веданне Ціханоўскай звязана і з ацэнкай палітычнага ладу Беларусі. Аўтарытарнай краіну называюць 82,6% тых, хто пра Ціханоўскую чуў, і 54,9% тых, хто не чуў.

Адрозненні прыкметныя таксама паводле полу, сямейнага становішча, занятасці, даходу, адукацыі і матэрыяльнага становішча. Наймацней вылучаецца ўзрост: пра Ціханоўскую чулі 40,0% рэспандэнтаў ва ўзросце 18–29 гадоў, 48,7% у групе 30–39 гадоў, 55,4% сярод 40–49-гадовых, 69,9% сярод 50–59-гадовых і 77,4% людзей, старэйшых за 60 гадоў.



Іл. 7. Вядомасць Святланы Ціханоўскай, %

Заўвага: N=1006.

У дачыненні да беларускіх уладаў найбольш распаўсюджана прагматычная пазіцыя: не развіваць актыўнага супрацоўніцтва, але захоўваць эканамічна выгадныя адносіны. Яе падтрымліваюць 44,9%. За ізаляцыю і міжнародныя санкцыі выступаюць 20,7%, за шырокае супрацоўніцтва і партнёрства — 11,6%, 22,8% не вызначыліся. Сярод негатыўна настроеных ізаляцыю падтрымліваюць 37,9%, сярод пазітыўна настроеных — 15,4%. Шырокае супрацоўніцтва выбіраюць адпаведна 4,0% і 19,8%.

Выбар палітыкі ў дачыненні да беларускіх уладаў звязаны з полам, узростам, занятасцю, даходам і фінансавым становішчам. Старэйшыя рэспандэнты і групы з больш устойлівым матэрыяльным становішчам часцей выбіраюць санкцыі і абмежаванне кантактаў; маладыя і менш забяспечаныя часцей падтрымліваюць прагматычныя адносіны або вагаюцца.

Узроставая залежнасць не зводзіцца да супрацьпастаўлення моладзі і старэйшых. За санкцыі і ізаляцыю выступаюць 13,5% рэспандэнтаў ва ўзросце 18–29 гадоў, каля 22–23% у групах 30–59 гадоў і 20,8% сярод людзей, старэйшых за 60 гадоў. Маладыя часцей выбіраюць актыўнае або прагматычнае супрацоўніцтва і часцей вагаюцца. Такім чынам, найвышэйшая падтрымка санкцый назіраецца ў групах 30–59 гадоў, а найніжэйшая — сярод рэспандэнтаў ва ўзросце 18–29 гадоў.



Іл. 8. Пажаданая палітыка Польшчы ў дачыненні да ўладаў Беларусі, %

Заўвага: N=1006.

У дачыненні да дэмакратычнай апазіцыі публічнае ўсебаковае супрацоўніцтва і афіцыйную падтрымку выбіраюць 31,7%, афіцыйныя сустрэчы і заявы — 24,7%, непублічнае супрацоўніцтва — 12,9%. Не развіваць супрацоўніцтва прапануюць 10,0%, яшчэ 20,7% цяжка даць пэўны адказ. Адрозненні паводле агульнага стаўлення да беларусаў тут асабліва вялікія: публічную падтрымку выбіраюць 41,1% пазітыўна настроеных і 18,1% негатыўна настроеных; адмову ад супрацоўніцтва — 5,6% і 28,2%, што ў цэлым дастаткова заканамерна.

Меркаванні пра супрацоўніцтва з дэмакратычнай апазіцыяй прыкметна адрозніваюцца паміж сацыяльнымі групамі. Публічнае супрацоўніцтва часцей падтрымліваюць мужчыны, старэйшыя рэспандэнты, людзі з вышэйшай адукацыяй і больш устойлівым матэрыяльным становішчам. Жанчыны і ўдзельнікі з абмежаванымі сродкамі часцей выбіраюць больш асцярожны варыянт або вагаюцца з адказам. Адрозненні прыкметныя таксама паводле памеру населенага пункта, занятасці, даходу і мовы хатніх зносін; паводле ваяводства і сямейнага становішча іх няма.

Найбольшы разрыў звязаны з полам. Публічнае ўсебаковае супрацоўніцтва выбіраюць 23,7% жанчын і 40,2% мужчын. Жанчыны часцей аддаюць перавагу больш асцярожным формам падтрымкі або не даюць пэўнага адказу. Узрост таксама змяняе «смеласць» пазіцыі: сярод старэйшых вышэйшая доля публічнай падтрымкі, сярод маладых — непублічнага супрацоўніцтва і нявызначанасці. Публічнае супрацоўніцтва часцей падтрымліваюць рэспандэнты з вышэйшай адукацыяй і больш устойлівым матэрыяльным становішчам.



Іл. 9. Пажаданая палітыка Польшчы ў дачыненні да дэмакратычнай апазіцыі Беларусі, %

Заўвага: N=1006.

Амаль палова праціўнікаў супрацоўніцтва з дэмакратычнай апазіцыяй — 46,5% — асцерагаецца яе залежнасці ад расійскага ўплыву. Магчымага пагаршэння адносін з беларускімі ўладамі хацелі б пазбегнуць 23,8%, а 16,8% лічаць апазіцыю занадта слабой і няздольнай уплываць на сітуацыю.



Іл. 10. Прычыны адмовы ад супрацоўніцтва з дэмакратычнай апазіцыяй, %


Заўвага: умоўнае пытанне, N=101.

Партыйныя адрозненні існуюць, але не фарміруюць цалкам аднастайных лагераў. Да беларусаў у Польшчы найбольш пазітыўна ставяцца выбаршчыкі КО (64,0%) і Новых левых (63,5%). У электарату Канфедэрацыі пазітыўная доля складае 43,2%, негатыўная — 28,4%. Сярод тых, хто не галасаваў, найбольшая група не вызначылася — 49,0%.

Адрозненні паміж прыхільнікамі партый нельга тлумачыць толькі іх палітычнымі поглядамі: гэтыя групы адрозніваюцца таксама паводле ўзросту, адукацыі, матэрыяльнага становішча і дасведчанасці пра беларускую палітыку. Тым не менш прыхільнікі КО, «Новых левых» і «Трэцяга шляху» ў цэлым лепш ставяцца да беларусаў і часцей падтрымліваюць супрацоўніцтва з дэмакратычнай апазіцыяй. Сярод выбаршчыкаў «Канфедэрацыі» і тых, хто не ўдзельнічаў у выбарах, больш прыкметныя падтрымка абмежаванняў і доля адказаў «цяжка сказаць». Пры гэтым ніводная з гэтых груп не прытрымліваецца адзінай пазіцыі.

Асабліва важна, што партыйныя адрозненні не адмяняюць агульных тэндэнцый. Ва ўсіх буйных электаральных стратах пазітыўнае стаўленне да беларусаў у Польшчы перавышае негатыўнае, а аўтарытарную ацэнку Беларусі выбірае большасць. Партыі адрозніваюцца галоўным чынам доляй тых, хто не вызначыўся, і ступенню гатоўнасці падтрымліваць апазіцыю або санкцыі. Іншымі словамі, палітычная канкурэнцыя змяняе акцэнты і жорсткасць, але не стварае двух палярных уяўленняў пра беларусаў і Беларусь.


Партыйныя адрозненні ў стаўленні да беларусаў, якія жывуць у Польшчы, %



Іл. 11. Партыйныя адрозненні ў стаўленні да беларусаў, якія жывуць у Польшчы, %

Заўвага: 47,6, df=10, p<0,001, V=0,155; катэгорыя «іншая партыя / камітэт» выключана праз невялікую колькасць адказаў.

Аўтарытарны характар Беларусі часцей прызнаюць прыхільнікі Трэцяга шляху (78,6%) і KO (77,9%). Сярод выбаршчыкаў PiS паказчык складае 63,2%, сярод Канфедэрацыі 69,1%, сярод тых, хто не галасаваў, — 54,1%. Тут партыйная сувязь крыху мацнейшая, але таксама не вызначае адказ цалкам, а паказчык у кожнай групе відавочна перавышае палову.




Іл. 12. Партыйныя адрозненні ў ацэнцы аўтарытарнага характару Беларусі, %


Заўвага: 31,4, df=5, p<0,001, V=0,178.

Публічную падтрымку дэмакратычнай апазіцыі часцей выбіраюць выбаршчыкі KO (44,2%), Новых левых (36,5%) і Трэцяга шляху (35,0%). Сярод прыхільнікаў PiS і Канфедэрацыі паказчык блізкі да 24%. Тыя, хто не галасаваў, часцей не маюць пэўнага пункту гледжання.

Партыйныя адрозненні ў палітыцы ў дачыненні да дэмакратычнай апазіцыі, % (1/2)



Іл. 13. Партыйныя адрозненні ў палітыцы ў дачыненні да дэмакратычнай апазіцыі, % (1/2)



Іл. 13. Партыйныя адрозненні ў палітыцы ў дачыненні да дэмакратычнай апазіцыі, % (2/2)

Заўвага: 80,3, df=20, p<0,001, V=0,142; N=996.

Менавіта таму непасрэдныя ацэнкі людзей і палітычныя ацэнкі дзяржавы разыходзяцца. Рэспандэнт можа станоўча ставіцца да беларусаў, лічыць Беларусь аўтарытарнай і адначасова падтрымліваць абмежаванні працоўнай міграцыі. Іншы можа крытыкаваць Лукашэнку, але не ведаць беларускіх культурных дзеячаў. Аналіз табліц спалучанасці паказвае, што такія спалучэнні не з'яўляюцца выключэннем: польская грамадская думка складаецца з некалькіх адносна самастойных вымярэнняў.


Кантакты, міграцыя, эканоміка і бяспека

Сваякоў, калег, знаёмых або сяброў сярод беларусаў маюць 15,0% рэспандэнтаў. Сярод пазітыўна настроеных гэтая доля складае 23,6%, сярод негатыўна настроеных — 8,5%. Пазітыўна да беларусаў у Беларусі ставяцца 78,1% тых, хто

мае асабістыя кантакты, і 44,8% тых, хто іх не мае. Сувязь статыстычна значная, аднак непасрэдныя зносіны застаюцца досведам меншасці, таму большасць ацэнак фарміруецца без іх.

Асабістыя кантакты з беларусамі часцей маюць маладыя рэспандэнты і людзі сярэдняга ўзросту. Адрозненні ў адукацыі і матэрыяльным становішчы не ўтвараюць паслядоўнай залежнасці і часткова звязаны з малалікімі групамі.

Сярод старэйшых рэспандэнтаў знаёмых беларусаў прыкметна менш. Ваяводствы таксама адрозніваюцца частатой кантактаў, але гэта не складаецца ва ўстойлівыя рэгіянальныя адрозненні агульнага стаўлення.



Іл. 14. Асабістыя кантакты з беларусамі, %

Заўвага: пытанне ахоплівае сваякоў, калег, знаёмых і сяброў.

Рашэнне польскага ўрада дазволіць прыехаць людзям, вымушаным пакінуць Беларусь пасля пратэстаў 2020 года, станоўча ацэньваюць 59,3% рэспандэнтаў, адмоўна — 19,8%, яшчэ 20,9% не вызначыліся. Сярод пазітыўна настроеных да беларусаў рашэнне ўхваляюць 70,1%, сярод негатыўна настроеных — 45,2%. Асабліва прыкметная сувязь з фінансавым становішчам: ухваленне ўзрастае ад 32,8% у найбольш уразлівай групе да 66,7% сярод рэспандэнтаў з устойлівым становішчам.

Рашэнне аб прыёме эмігрантаў пасля 2020 года па-рознаму ацэньваюць мужчыны і жанчыны, рэспандэнты рознага ўзросту, занятасці, даходу і адукацыі. Асабліва прыкметны разрыў паводле матэрыяльнага становішча: тыя, каму даводзіцца эканоміць нават на паўсядзённых выдатках, ухваляюць яго радзей, чым людзі з сярэднім або ўстойлівым дастаткам. Гэта можа быць звязана з больш вострым адчуваннем нястачы рэсурсаў і канкурэнцыі за іх. Тут адрозненні выяўлены мацней, чым у агульным стаўленні да беларусаў.

Пол і ўзрост таксама адрозніваюць адказы аб прыёме эмігрантаў. Станоўча рашэнне ацэньваюць 52,7% жанчын і 66,4% мужчын. Паводле ўзросту падтрымка ўзрастае ад 51,6% сярод рэспандэнтаў ва ўзросце 18–29 гадоў да 67,0% сярод людзей, старэйшых за 60 гадоў. Разрыў звязаны з агульнай ацэнкай беларускага рэжыму. Аднак фінансавае становішча застаецца мацнейшым фактарам: у найбольш уразлівай групе ўхваленне амаль удвая ніжэйшае, чым сярод матэрыяльна ўстойлівых рэспандэнтаў.



Іл. 15. Ацэнка рашэння прыняць беларусаў пасля 2020 года, %

Заўвага: N=1006.

Большасць рэспандэнтаў — 64,8% — не лічыць грамадзян Беларусі, якія жывуць у Польшчы, пагрозай нацыянальнай бяспецы: 16,7% адказваюць «безумоўна не», 48,1% — «хутчэй не». Процілеглую думку маюць 17,7%, яшчэ столькі ж вагаюцца.

Стаўленне да беларусаў і ацэнка магчымых рызык звязаныя, але не супадаюць. Сярод негатыўна настроеных небяспеку бачаць 27,7%, сярод пазітыўна настроеных — 18,6%. Нават сярод тых, хто выбраў адказ «безумоўна так», прыкметная доля ставіцца да беларусаў станоўча. Такім чынам, частка рэспандэнтаў аддзяляе стаўленне да людзей ад уяўленняў пра бяспеку.

Адказы на пытанне пра пагрозу адрозніваюцца паводле полу, узросту, месца жыхарства, сямейнага становішча, занятасці, даходу і матэрыяльнага становішча. Людзі з больш устойлівым дастаткам часцей не бачаць у беларусах пагрозы. Сярод тых, каму даводзіцца эканоміць нават на асноўных выдатках, больш і асцярог, і адказаў «цяжка сказаць». Адукацыя і мова хатніх зносін з гэтымі ацэнкамі не звязаны. У цэлым трывога наконт бяспекі часцей сустракаецца ў матэрыяльна менш забяспечаных рэспандэнтаў.



Іл. 16. Успрыманне беларусаў у Польшчы як пагрозы нацыянальнай бяспецы, %

Заўвага: N=1006.

Сярод 178 рэспандэнтаў, якія адказалі на ўмоўнае адкрытае пытанне, 29,8% не назвалі канкрэтнай крыніцы пагрозы. Сярод названых прычын часцей за ўсё згадваліся шпіянаж і разведка (11,2%), сувязі з Расіяй і беларускімі ўладамі (7,9%), злачыннасць і гвалт (7,9%), а таксама пагроза рынку працы (7,3%). Такім чынам, названыя асцярогі часцей звязаны з дзейнасцю дзяржавы і пытаннямі бяспекі, чым з паўсядзённымі паводзінамі беларусаў у Польшчы.

Частка рэспандэнтаў дапускае рызыку, але не можа назваць яе крыніцы. Сярод канкрэтных прычын найчасцей згадваюцца шпіянаж і разведка, недавер да замежных грамадзян, сувязі з Расіяй і беларускімі ўладамі, а таксама злачыннасць і гвалт.



Іл. 17. Якія пагрозы звязваюць з грамадзянамі Беларусі ў Польшчы, %

Заўвага: адкрытае пытанне з наступным кадаваннем; прыведзены долі сярод 178 рэспандэнтаў, якія далі валідны адказ на ўмоўнае пытанне.

Станоўча ўнёсак беларусаў у польскую эканоміку ацэньваюць 42,1% рэспандэнтаў, адмоўна 13,1%, нейтральна — 24,3%; яшчэ 20,5% цяжка адказаць. Сярод пазітыўна настроеных да беларусаў станоўчую ацэнку даюць 56,3%, сярод негатыўна настроеных — 25,4%. Сярод тых, хто лічыць унёсак беларусаў значным і станоўчым, 81,8% пазітыўна ставяцца да іх у Беларусі і 88,9% — у Польшчы. Эканамічная ацэнка цесна звязана з агульным стаўленнем да беларусаў.

Ацэнка эканамічнага ўнёску адрозніваецца паводле полу, узросту, памеру населенага пункта, занятасці, даходу, адукацыі і матэрыяльнага становішча. Найбольш выразны разрыў звязаны менавіта з апошнім: станоўча ўнёсак ацэньваюць 26,1% рэспандэнтаў у самай уразлівай групе і 53,9% сярод тых, чыё становішча ўстойлівае.

Мужчыны станоўча ацэньваюць унёсак прыкметна часцей за жанчын — 49,6% супраць 35,1%. Разрыў звязаны найперш з большай доляй адказу «цяжка сказаць» сярод жанчын, а не з больш выяўленым негатывам. Паводле ўзросту і памеру населенага пункта карціна менш паслядоўная: больш спрыяльныя адказы пераважаюць сярод рэспандэнтаў эканамічна актыўнага ўзросту і жыхароў буйных гарадоў, але лінейнай залежнасці няма. У цэлым матэрыяльнае становішча звязана з успрыманнем унёску мацней за большасць іншых сацыяльна-дэмаграфічных характарыстык.



Іл. 18. Ацэнка эканамічнага ўнёску беларусаў, якія жывуць у Польшчы, %

Заўвага: N=1006.

Погляды на працоўную міграцыю з Беларусі прыкметна разыходзяцца. Скараціць колькасць мігрантаў, якія ўжо знаходзяцца ў Польшчы, прапануюць 22,6% рэспандэнтаў, яшчэ 20,3% выступаюць за спыненне далейшага прытоку без змяншэння іх цяперашняй колькасці. Дазволіць уезд на агульных для

грамадзян краін па-за ЕС умовах гатовыя 33,7%, а стымуляваць яго — 6,0%; 17,5% цяжка адказаць.

Сярод негатыўна настроеных да беларусаў скарачэнне колькасці мігрантаў падтрымліваюць 45,8%, сярод пазітыўна настроеных — 12,4%. За агульныя правілы ўезду для грамадзян краін па-за ЕС выступаюць адпаведна 16,9% і 46,1%.

Адказы на пытанне аб працоўнай міграцыі адрозніваюцца паводле полу, узросту, занятасці, даходу, адукацыі і матэрыяльнага становішча. Жанчыны і рэспандэнты з абмежаванымі сродкамі часцей выбіраюць абмежаванні або вагаюцца з адказам. Людзі з больш высокім даходам і адукацыяй прыкметна ахвотней дапускаюць захаванне цяперашняга ўзроўню міграцыі або яе пашырэнне. Памер населенага пункта, ваяводства, сямейнае становішча і мова хатніх зносін істотнай ролі не адыгрываюць. Такім чынам, стаўленне да працоўнай міграцыі найцясней звязана з ацэнкай яе эканамічных наступстваў.



Іл. 19. Пажаданая палітыка ў дачыненні да працоўнай міграцыі з Беларусі, %

Заўвага: N=1006.

Меркаванні пра тое, наколькі небяспечная беларуская дзяржава, падзяліліся амаль пароўну. Нізкі ўзровень пагрозы, ад 1 да 3 балаў паводле дзесяцібальнай шкалы, указалі 27,4% рэспандэнтаў; сярэдні, ад 4 да 6, выбралі 29,2%; высокі, ад 7 да 10, — 32,3%; яшчэ 11,0% не змаглі адказаць. Сярод негатыўна настроеных да беларусаў высокую ступень рызыкі называюць 43,5%, сярод пазітыўна настроеных — 30,7%. Аднак стаўленне да дзяржавы і да людзей не супадае: многія з тых, хто лічыць беларускую дзяржаву небяспечнай, станоўча ставяцца да беларусаў.

Адказы адрозніваюцца найперш паводле полу і матэрыяльнага становішча. Мужчыны часцей ставяць як высокія, так і нізкія балы, а жанчыны выбіраюць сярэдзіну шкалы або вагаюцца з адказам. У групе з найбольш цяжкім матэрыяльным становішчам высокую рызыку адзначаюць крыху часцей, аднак розніца тут меншая, чым у пытаннях працоўнай міграцыі і ўнёску ў эканоміку.




Іл. 20. Ацэнка пагрозы з боку беларускай дзяржавы, %

Заўвага: зыходная шкала 1–10 згрупавана ў тры дыяпазоны.

Спадчына

Спадчына Рэчы Паспалітай. Амаль палова рэспандэнтаў — 45,9% — лічыць палітычную і культурную спадчыну Першай Рэчы Паспалітай выключна польскай. Больш «інклюзіўны» варыянт, згодна з якім спадчына належыць усім народам, што жылі ў ёй, выбіраюць 28,3%. Варыянт супольнай польска-беларускай спадчыны падтрымліваюць 4,4%. Выключальная пазіцыя прыкметна часцей сустракаецца сярод негатыўна настроеных да беларусаў — 62,1% супраць 36,5% сярод пазітыўна настроеных.

Каму належыць спадчына Першай Рэчы Паспалітай, %




Іл. 21. Каму належыць спадчына Першай Рэчы Паспалітай, %

Заўвага: N=1006.

Ідэя новага герба Беларусі, натхнёнага гербам Рэчы Паспалітай, не атрымлівае шырокай падтрымкі. Негатыўна да яе ставяцца 36,3%, пазітыўна 18,7%, нейтральна — 45,0%. Сярод пазітыўна настроеных да беларусаў доля падтрымкі дасягае 28,7%, сярод негатыўна настроеных — 11,9%.

Стаўленне да магчымага новага герба Беларусі, %



Іл. 22. Стаўленне да магчымага новага герба Беларусі, %

Заўвага: N=1006.

Меркаванні пра нацыянальную самастойнасць беларусаў падзяліліся амаль пароўну: 39,2% лічаць іх асобным народам, 35,4% — адгалінаваннем рускага,


5,9% — украінскага; 19,6% не змаглі адказаць. Гэтая пазіцыя цесна звязана з агульным стаўленнем да беларусаў. Сярод рэспандэнтаў з пазітыўнай ацэнкай 50,7% прызнаюць іх асобным народам, а 27,7% адносяць да рускага; сярод настроеных негатыўна — 22,0% і 58,8% адпаведна.



Іл. 23. Уяўленне пра беларусаў як народ, %

Заўвага: групы стаўлення сфарміраваныя паводле адказаў пра беларусаў, якія жывуць у Беларусі.

Да таго, што Адама Міцкевіча і Тадэвуша Касцюшку лічаць часткай беларускай гісторыка-культурнай спадчыны, 41,7% рэспандэнтаў ставяцца негатыўна, 16,6% пазітыўна, яшчэ 41,7% — нейтральна. Сярод негатыўна настроеных да беларусаў адмоўна адказваюць 61,0%, сярод пазітыўна настроеных — 32,7%. Станоўча адказваюць, адпаведна, 6,8% і 27,9%.



Іл. 24. Стаўленне да беларускай інтэрпрэтацыі Міцкевіча і Касцюшкі, %

Заўвага: N=1006.

Культура

Веданне беларускіх гістарычных і культурных дзеячаў застаецца нізкім. 63,1% не ведаюць нікога з дзевяці пералічаных асоб, яшчэ 9,1% вагаюцца з адказам. Найбольш вядомыя Янка Купала (10,3%), Кастусь Каліноўскі і Святлана Алексіевіч (па 8,3%), Усяслаў Полацкі — 6,9%. Францыска Скарыну ведаюць 4,6%. Нават сярод пазітыўна настроеных большасць (54,3%) не ведае нікога са спіса.

Высокая доля няведання не азначае, што рэспандэнты не маюць меркавання пра Беларусь. Яны могуць ацэньваць міграцыю, палітычны рэжым або адносіны з Расіяй, не ведаючы гістарычных і літаратурных дзеячаў. Для інтэрпрэтацыі гэта важна: у польскай грамадскай думцы Беларусь значна больш прыкметная як палітычная, чым як культурная тэма. Веданне дзеячаў звязана з больш

пазітыўным стаўленнем, але культурная дасведчанасць застаецца толькі адным з фактараў.



Іл. 25. Веданне беларускіх дзеячаў культуры і гісторыі, % ад усёй выбаркі

Заўвага: множны выбар; долі не складаюцца ў 100%.

Веданне беларускіх гістарычных і культурных дзеячаў звязана са стаўленнем да беларусаў. Прынамсі адну асобу пазнаюць 38,1% пазітыўна настроеных і 22,0% негатыўна настроеных. Гэтая сувязь прыкметная ў табліцах спалучанасці, аднак сама па сабе не азначае, што веданне культуры фарміруе сімпатыю да беларусаў.

Адказы на гістарычныя і культурныя пытанні адрозніваюцца ў залежнасці ад сацыяльнага становішча рэспандэнтаў, але адзінай заканамернасці тут няма. Меркаванні пра спадчыну Рэчы Паспалітай звязаны з полам, узростам, памерам населенага пункта, занятасцю, даходам, адукацыяй і фінансавым становішчам. Пытанне пра магчымы беларускі герб — найперш з полам, занятасцю і адукацыяй. Уяўленне пра беларусаў як самастойны народ адрозніваецца таксама паводле сямейнага становішча і мовы хатніх зносін. У

ацэнках сувязі Міцкевіча і Касцюшкі з беларускай спадчынай найбольш паслядоўна праяўляецца толькі адукацыя.

Больш адукаваныя рэспандэнты часцей пазнаюць асобных дзеячаў. Паводле ўзросту агульнай заканамернасці няма. Пры гэтым веданне імёнаў не азначае падтрымкі беларускай трактоўкі агульнай спадчыны. Ва ўсіх узроставых групах пераважае думка, што спадчына Рэчы Паспалітай належыць выключна Польшчы. Памер населенага пункта мае значэнне толькі для гэтага пытання і не ўплывае на стаўленне да герба або да ўключэння Міцкевіча і Касцюшкі ў беларускую гісторыка-культурную традыцыю.

Адукацыя вылучаецца як найбольш устойлівы фактар: яна звязана з адказамі пра Рэч Паспалітую, герб, самастойнасць беларускага народа, Міцкевіча і Касцюшку, а таксама з веданнем асобных дзеячаў. Аднак і сярод рэспандэнтаў з вышэйшай адукацыяй беларуская трактоўка агульнай спадчыны не становіцца пераважнай. Сувязі з сямейным становішчам, ваяводствам і мовай хатніх зносін узнікаюць толькі ў асобных выпадках і часта заснаваны на малых групах, таму рабіць з іх шырокія рэгіянальныя або моўныя высновы нельга.



Іл. 26. Культурная дасведчанасць у групах стаўлення да беларусаў, %

Заўвага: паказаны выбраныя індыкатары.

Параўнанне з іншымі даследаваннямі ў Польшчы

Для параўнання выкарыстаны публікацыі CBOS, IPSOS Polska і факультэта сацыялогіі Варшаўскага ўніверсітэта, аднак яны змяшчаюць розныя даныя. CBOS — адзіная крыніца, якая дазваляе прасачыць, як змянялася стаўленне да беларусаў. IPSOS апублікаваў у 2024 годзе адзін блізкі паказчык, але без поўнага размеркавання адказаў. Працы Варшаўскага ўніверсітэта даюць навуковы кантэкст, аднак супастаўных працэнтных даных у іх няма. Таму зводзіць матэрыялы трох крыніц у адзіны шэраг нельга.

Для параўнання ўдалося выкарыстаць 14 пытанняў CBOS з поўным размеркаваннем адказаў і адзін частковы паказчык IPSOS. Астатнія матэрыялы не змяшчалі дастаткова звестак пра фармулёўкі, варыянты адказу, тэрміны апытання і выбарку, таму ў аналіз не ўвайшлі.

З вынікамі гэтага даследавання 2026 года гэтыя лічбы можна параўноўваць толькі ў самых агульных рысах. CBOS пытаецца пра стаўленне да «Białorusini» без удакладнення месца іх пражывання, а сямібальную шкалу зводзіць да сімпатыі, абыякавасці і непрыязнасці. У новым апытанні асобна пыталіся пра грамадзян Беларусі, якія жывуць у самой краіне і ў Польшчы, а варыянту «абыякавасць» не было. Таму долю станоўчых адказаў 2026 года нельга дадаваць да графіка CBOS як чарговы пункт. Новае апытанне не працягвае ранейшага шэрагу, а дазваляе ўбачыць адрозненні, якіх ён не адлюстроўвае.

Крыніцы польскіх даследаванняў і межы супастаўнасці

Крыніцы даследаванняў

CBOS
35 публікацый; 14 цалкам праверaных картак пытанняў; паўторны шэраг стаўлення да беларусаў за 2021–2025 гады
Асноўная колькасная крыніца

IPSOS Polska
Пяць публікацый; за 2024 год апублікавана доля сімпатыі да беларусаў — 27%, без поўнага размеркавання шкалы
Толькі асобнае супастаўленне з агаворкамі

Факультэт сацыялогіі Варшаўскага ўніверсітэта
Сем акадэмічных спасылак за 2018–2023 гады, без пытанняў, працэнтаў і баз
Тэматычны кантэкст, не апытальны шэраг

Іл. 27. Крыніцы польскіх даследаванняў і межы супастаўнасці

Заўвага: падобныя паказчыкі розных службаў нельга механічна аб'ядноўваць праз адрозненні ў пытаннях, шкалах, метадах і тэрмінах палявых работ.


Дынаміка стаўлення да беларусаў

Адзіны цалкам супастаўны шэраг заснаваны на паўторным пытанні CBOS «Jaki jest Pana(i) stosunek do Białorusinów?» («Як вы ставіцеся да беларусаў?»). Фармулёўка не ўдакладняе грамадзянства або месца пражывання, таму яе нельга наўпрост звязваць з гэтым даследаваннем. Акрамя таго, CBOS выкарыстоўвае згрупаваную шкалу сімпатыі, абыякавасці і непрыязнасці, тады як гэтае апытанне падзяляе пазітыўныя і негатыўныя ацэнкі паводле ступені інтэнсіўнасці і асобна пытаецца пра беларусаў у Беларусі і Польшчы.

У лютым 2021 года сімпатыю да беларусаў выказвалі 47%, непрыязнасць — 17%. У студзені 2022 года сімпатыя знізілася да 35%, непрыязнасць вырасла да 29%. Найбольш рэзкі зрух адбыўся паміж хвалямі 2022 і 2023 гадоў: сімпатыя склала 19%, непрыязнасць — 51%. У 2024 годзе паказчыкі часткова змякчыліся — 24% і 47%, але ў 2025 годзе сімпатыя зноў знізілася да 20%, а непрыязнасць склала 48%. Доля адказу «цяжка сказаць» заставалася амаль нязменнай — 8–9%.

Розніца паміж 2021 і 2025 гадамі складае 27 працэнтных пунктаў што да сімпатыі і 31 пункт у непрыязнасці. У наяўных публікацыях няма падстаў

зводзіць гэтую змену да аднаго фактару. Перыяд ахоплівае міграцыйны крызіс на польска-беларускай мяжы, расійскае ўварванне ва Украіну і саюзную палітыку беларускіх уладаў. Шэраг фіксуе змену масавых ацэнак, але не дазваляе аддзяліць унёсак кожнай падзеі.



Іл. 28. Стаўленне да беларусаў у апытаннях CBOS, 2021–2025, %

Заўвага: крыніца — CBOS, серыя Stosunek do innych narodów / Stosunek Polaków do innych narodów. У 2023 і 2025 гадах сума адрозніваецца ад 100% праз акругленне.

Змены адбываліся нераўнамерна. З 2021-га да 2022 года доля тых, хто сімпатызаваў, знізілася на 12 п.п., а доля тых, хто ставіўся да беларусаў з непрыязнасцю, выросла на столькі ж. У 2023 годзе пагаршэнне працягнулася:

сімпатыя скарацілася яшчэ на 16 п.п., непрыязнасць павялічылася на 22 п.п. У 2024 годзе паказчыкі крыху палепшыліся, але да ўзроўню 2022 года не вярнуліся. У 2025 годзе доля негатыўных ацэнак амаль не змянілася, тады як сімпатыя зноў знізілася. Такім чынам, у 2023–2025 гадах пераважалі неспрыяльныя ацэнкі, а паслядоўнага аднаўлення не адбылося.

Абыякавасць змянялася значна менш: 28% у 2021–2022 гадах, 21% у 2023–2024 гадах і 24% у 2025-м. Асноўнае пераразмеркаванне адбывалася паміж сімпатыяй і непрыязнасцю, а не за кошт росту нявызначанасці. Гэта адрознівае шэраг CBOS ад вынікаў 2026 года, дзе вельмі вялікая доля адказу «цяжка сказаць». Розніца можа быць звязана як са зменай меркаванняў, так і з адрозненнямі шкал: нейтральная пазіцыя CBOS і адмова ад пэўнай ацэнкі ў новым апытанні не з'яўляюцца аднолькавымі катэгорыямі.

Увесну 2024 года IPSOS зафіксаваў 27% сімпатыі да беларусаў, а CBOS прыкладна ў той жа час — 24%. Розніцу ў 3 п.п. нельга лічыць разыходжаннем паміж апытаннямі: пытанні былі сфармуляваны па-рознаму, адрозніваліся час і спосаб правядзення, а IPSOS апублікаваў толькі долю станоўчых адказаў. Таму гэты вынік нельга ставіць у адзін шэраг з данымі CBOS за іншыя гады.

Пратэсты 2020 года і палітыка Польшчы

У верасні 2020 года падзеі ў Беларусі прыцягвалі значную ўвагу польскага грамадства: 14% вельмі цікавіліся тым, што адбываецца, і 59% цікавіліся ў пэўнай ступені; 26% не цікавіліся. Афіцыйна абвешчаны вынік прэзідэнцкіх выбараў лічылі сфальсіфікаваным 73% рэспандэнтаў, не лічылі 6%, яшчэ 21% вагаліся. Гэтыя паказчыкі датычацца канкрэтнага палітычнага крызісу, а не агульнага стаўлення да беларусаў.

Удзельнікам пратэстаў спачувалі 59%, не спачувалі 4%, 29% ставіліся да пратэстаў абыякава. У пытанні пра палітыку Польшчы 58% выбіралі падтрымку прадэмакратычных імкненняў беларусаў сумесна з іншымі краінамі ЕС, яшчэ 13% — асаблівую падтрымку з боку Польшчы. Неўмяшанню аддавалі перавагу 20%. Такім чынам, падтрымка пратэстаў і еўрапейскага фармату дзеянняў пераважала, але побач з ёй існавалі значныя групы абыякавых і прыхільнікаў нейтралітэту.


Сітуацыю ў Беларусі пагрозай бяспецы Польшчы лічылі 44%, не лічылі 41%, 15% не вызначыліся. Гэты амаль роўны баланс адрозніваецца ад больш адназначных ацэнак выбараў і пратэстаў. Польскае грамадства магло адначасова спачуваць удзельнікам пратэстаў і бачыць рызыкі, звязаныя з нестабільнасцю ў суседняй краіне.

Цікавасць да падзей




Іл. 29. Ацэнка падзей у Беларусі і пажаданая палітыка Польшчы, CBOS, верасень 2020, % (1/5)

Фальсіфікацыя выбараў




Іл. 29. Ацэнка падзей у Беларусі і пажаданая палітыка Польшчы, CBOS, верасень 2020, % (2/5)

Стаўленне да пратэстаў



Іл. 29. Ацэнка падзей у Беларусі і пажаданая палітыка Польшчы, CBOS, верасень 2020, % (3/5)



Іл. 29. Ацэнка падзей у Беларусі і пажаданая палітыка Польшчы, CBOS, верасень 2020, % (4/5)



Іл. 29. Ацэнка падзей у Беларусі і пажаданая палітыка Польшчы, CBOS, верасень 2020, % (5/5)

Заўвага: крыніца — CBOS, Polacy o protestach na Białorusi, палявыя работы 7–17 верасня 2020 года, рэалізаваная выбарка N=1149.


Мяжа, міграцыя і бяспека ў 2021 годзе

У апытаннях 2021 года Беларусь згадвалася найперш у сувязі з крызісам на польска-беларускай мяжы. Пытанні датычыліся мігрантаў з трэціх краін, надання прытулку, будаўніцтва памежнай агароджы і імавернасці ўзброенага канфлікту. Паводле гэтых даных нельга меркаваць пра стаўленне да беларускіх мігрантаў або да беларусаў у цэлым.

Доступ мігрантаў на польска-беларускай мяжы да прытулку падтрымлівалі 33% і ў верасні, і ў снежні 2021 года. Доля адмоўных адказаў выраслa з 52% да 58%, а нявызначанасць знізілася з 15% да 9%. Вераснёўская фармулёўка змяшчала падрабязнае ўводнае сцверджанне пра арганізацыю міграцыйнай

плыні беларускімі ўладамі, таму два пункты супастаўныя толькі з агаворкамі і не ўтвараюць паўнавартаснага трэнду.

У снежні 2021 года будаўніцтва бар'ера на мяжы падтрымлівалі 66%, выступалі супраць 26%. Магчымага ўзброенага канфлікту праз сітуацыю на мяжы асцерагаліся 64%, не асцерагаліся 31%. Абодва вынікі датычацца інструментаў памежнага кантролю і ўспрымання рызыкі. Яны не паказваюць, як рэспандэнты ставіліся да грамадзян Беларусі, якія жывуць у Польшчы.



Іл. 30. Мяжа і бяспека, CBOS, 2021 год, %

Заўвага: крыніцы — CBOS, Opinia publiczna wobec uchodźców i sytuacji migrantów na granicy z Białorusią; Opinia publiczna wobec kryzysu na granicy z Białorusią.

У цэлым польскія даследаванні паказваюць некалькі розных працэсаў. Да 2021 года беларусы мелі параўнальна станоўчы вобраз, затым у серыі CBOS адбыўся рэзкі рост непрыязнасці. У 2020 годзе пратэсты і прадэмакратычныя імкненні атрымлівалі шырокую падтрымку. У 2021 годзе памежны крызіс узмацніў запатрабаванасць кантролю і бяспекі. Гэтыя вымярэнні нельга звесці да адной лініі: стаўленне да беларусаў, падтрымка пратэстаў, ацэнка беларускіх уладаў і стаўленне да мігрантаў на мяжы датычацца розных аб'ектаў і палітычных сітуацый.

Агульная сімпатыя або непрыязнасць да беларусаў тут таксама мае значэнне. У апытанні CBOS 2025 года беларусы апынуліся сярод груп, да якіх негатыўнае стаўленне пераважала над пазітыўным, разам з расіянамі, ромамі, украінцамі, палесцінцамі і яўрэямі. Аднак пасля 2020 года на іх уплывалі і іншыя падзеі: палітычная эміграцыя, пратэсты, крызіс на мяжы, пытанні бяспекі і падтрымка Расіі з боку беларускіх уладаў. Новае апытанне паказвае, што гэтыя фактары дзейнічаюць па-рознаму. Большасць не лічыць беларусаў, якія жывуць у Польшчы, пагрозай, хоць многія выступаюць за абмежаванне працоўнай міграцыі. Крытыка рэжыму спалучаецца з добразычлівым стаўленнем да людзей, а падтрымка дэмакратычнай апазіцыі — з нежаданнем супрацоўнічаць з дзейнай уладай.

Асноўныя высновы

Пазітыўнае стаўленне да беларусаў пераважае, але не ахоплівае грамадства безумоўна. Да беларусаў у Беларусі пазітыўна ставяцца 49,8%, негатыўна — 17,6%; амаль траціна не вызначылася. Да беларусаў у Польшчы пазітыўная доля вышэйшая — 55,7%, а негатыўная амаль не змяняецца. Да беларусаў, якія жывуць у Польшчы, пазітыўна ставяцца крыху часцей, чым да беларусаў у Беларусі, а долі негатыўных адказаў амаль аднолькавыя.

Адзінага сацыяльна-дэмаграфічнага партрэта прыхільніка або праціўніка беларусаў не ўзнікае. Пол, занятасць, даход, адукацыя, фінансавае становішча і часам мова хатніх зносін адрозніваюць адказы, але сувязі з непасрэднай сімпатыяй застаюцца слабымі. Узрост не звязаны са стаўленнем да беларусаў у Польшчы, хоць прыкметна адрознівае палітычную інфармаванасць, ацэнку рэжыму, Лукашэнкі і апазіцыі. Найбольш паслядоўная сацыяльная лінія праходзіць праз матэрыяльнае становішча: эканамічна ўразлівыя групы больш асцярожна ацэньваюць прыём эмігрантаў, унёсак беларусаў і міграцыю.

Гісторыка-культурныя ўяўленні складаюць самастойную частку стаўлення да беларусаў. Прызнанне беларусаў асобным народам, інклюзіўнае разуменне спадчыны Рэчы Паспалітай і прыняцце беларускай сувязі з агульнымі гістарычнымі асобамі часцей спалучаюцца з пазітыўнай ацэнкай. Аднак культурная дасведчанасць застаецца нізкай: большасць не пазнае ніводнай з пералічаных беларускіх асоб. Адукацыя звязана з культурнай дасведчанасцю, тады як узрост асабліва прыкметна звязаны з вядомасцю Святланы Ціханоўскай.

Практычныя пытанні міграцыі, эканомікі і бяспекі ствараюць найбольш заўважныя адрозненні. Большасць не лічыць беларусаў у Польшчы пагрозай, а

станоўчая ацэнка іх эканамічнага ўнёску заўважна часцей сустракаецца сярод прыхільнікаў адкрытай міграцыйнай палітыкі. Тут асабліва важныя даход і фінансавае становішча: у матэрыяльна ўразлівых групах асцярожныя ацэнкі сустракаюцца часцей, тады як больш устойлівыя групы часцей станоўча ацэньваюць эканамічны ўнёсак і падтрымліваюць прыём эмігрантаў.

Крытыка беларускага рэжыму распаўсюджана значна шырэй, чым негатыўнае стаўленне да беларусаў. Каля сямі з дзесяці лічаць Беларусь аўтарытарнай, не прызнаюць Лукашэнку легітымным і апісваюць замежную палітыку краіны як залежную ад Расіі. Гэтыя ацэнкі сацыяльна структураваныя мацней, чым непасрэдная сімпатыя да людзей: старэйшыя, больш адукаваныя і матэрыяльна ўстойлівыя рэспандэнты часцей займаюць пэўную крытычную пазіцыю, тады як маладыя і ўразлівыя групы часцей не даюць адказу.

У дачыненні да ўладаў Беларусі пераважае прагматычная лінія: абмежаваныя эканамічна выгадныя кантакты падтрымліваюць часцей, чым поўную ізаляцыю або актыўнае супрацоўніцтва. Да дэмакратычнай апазіцыі стаўленне больш адкрытае, аднак формы падтрымкі адрозніваюцца паводле полу, узросту, адукацыі і матэрыяльнага становішча. Партыйныя адрозненні прыкметныя, але не ствараюць двух цалкам аднастайных лагераў.

Польскія апытанні 2020–2025 гадоў паказваюць фон, на якім сфарміраваліся гэтыя адказы. Пасля пратэстаў 2020 года агульная сімпатыя да беларусаў у серыі CBOS рэзка знізілася, а памежны крызіс звязаў Беларусь з пытаннямі бяспекі і міграцыі. Новае апытанне ўдакладняе гэтую карціну: стаўленне да беларусаў нельга апісаць адной шкалой сімпатыі, паколькі ацэнкі людзей, мігрантаў, дзяржавы, рэжыму і апазіцыі прыкметна разыходзяцца.

Інстытут палітычных даследаванняў «Палітычная сфера»
Свае ці чужыя?
Як успрымаюць беларусаў у Польшчы

www.palityka.org

